аснове прыказак, якія маюць аднолькавую сутнасць, ляжаць розныя асацыяцыі, звязаныя са спецыфікай быту, гісторыі, культуры, традыцый, звычаяў тых народаў, якія іх прыдумалі.

ЛІТАРАТУРА

1. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі, Г. А. Барташэвіч, Е. П. Кабашнікаў; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 439 с. УДК 182.12.451

УДК 811 161.3”38”

Студ. Д.А. Зайцаў, Ц.Д. Рэўт
Навук. кір. заг. кафедры В.У. Русак (кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

## МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ: ГІСТОРЫЯ І ТРАДЫЦЫІ СВЯТА

Шматмоўныя і шматкультурныя грамадствы маюць поспех дзякуючы захаванню мясцовых моў, якія служаць праваднікамі традыцыйных ведаў і культурнай спадчыны. Аднак моўная разнастайнасць сёння знаходзіцца пад пагрозай, паколькі ўсё больш моў знікае. У наш час 40% насельніцтва свету не мае доступу да адукацыі на роднай мове, у некаторых рэгіёнах гэты паказчык складае 90%.

Міжнародны дзень роднай мовы заснаваны рашэннем 30-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года. У Сусветны каляндар свята уключана ў 2000 годзе і адзначаецца 21 лютага. ААН ухваліла заснаванне новай даты і заклікала дзяржавы спрыяць зберажэнню моў народаў зямлі. Мэтамі свята з’яўляецца садзейнічанне моўнай і культурнай разнастайнасці, абарона знікаючых моў і прызнанне ўсіх моў аднолькава каштоўнымі.

Свята мае пад сабой гістарычную падставу: 21 лютага 1952 года бенгальская моладзь мужна ўстала на абарону роднай мовы супраць узброенай вінтоўкамі паліцыі. Такім чынам, абраная дата супадае з Днём руху за бенгальскую мову, якая адзначаецца ў Бангладэш як дзень памяці пра крывавыя падзеі 1952 года. Перадумовы трагедыі бяруць пачатак з 1947 г., калі Бангладэш быў часткай Пакістана. У 1948 г. мова урду была аб’яўлена адзінай дзяржаўнай мовай на ўсёй тэрыторыі Пакістана, нягледзячы на тое, што ў Бангладэш людзі размаўлялі на бенгальскай мове. Падняўся рух за дзяржаўны статус бенгальскай мовы. Студэнты-бенгальцы распачалі масавыя пратэсты супраць абвяшчэння урду дзяржаўнай мовай. 21 лютага 1952 г. актывісты руху былі расстраляныя пакістанскай паліцыяй.

Кожны год 21 лютага ў штаб-кватэры ЮНЕСКА і ў яе філіялах праводзяцца выставы і прэзентацыі, якія прысвячаюцца мовам, арганізуюцца святочныя канцэрты. У адукацыйных установах праходзяць тэматычныя заняткі. Праводзяцца конкурсы сярод знаўцаў роднай мовы. Бібліятэкі арганізуюць кніжныя выставы беларускамоўных выданняў; музеі ладзяць публічныя чытанні беларускамоўных твораў пісьменнікамі, акцёрамі, мастакамі і дзяржаўнымі дзеячамі; праводзяцца агульнабеларускія дыктоўкі, прэзентацыі новых беларускамоўных кніг, беларускамоўныя дыскатэкі і канцэрты.

УДК 81-24

Студ. В.В. Краеўская, А.В. Цімашэнка
Навук. кір. заг. кафедры В.У. Русак (кафедра беларускай філалогіі БДТУ)

## ПРЫЧЫНЫ ЗНІКНЕННЯ МОЎ

Мы ведаем пра існаванне моў, на якіх у наш час ніхто не размаўляе: лацінская, санскрыт, гоцкая і многія іншыя. У нашы дні колькасць моў на планеце хутка памяншаецца, у геаметрычнай прагрэсіі павялічваецца хуткасць паглынання малых моў вялікімі. Мовы знікаюць, але новыя не з’яўляюцца. Разгледзім прычыны гэтага працэсу.

Адна з прычын – войны і фізічнае знішчэнне носьбітаў мовы. Напрыклад, іспанскія каланізатары захапілі тэрыторыю сучаснага Сальвадора, пасля гэтага ў жывых засталося зусім няшмат карэнных жыхароў – носьбітаў мовы ленка і какапера, і гэтыя мовы зніклі.

Другая прычына – эпідэміі. У мінулыя часы носьбіты мовы вымiралі ў сувязі з эпідэміямі. Так, прусы (і пруская мова адпаведна) зніклі ў сувязі з эпідэміяй чумы.

Аднак часцей мовы знікаюць не так імкліва, а на працягу жыцця некалькіх пакаленняў. Як правіла, гэта абдываецца тады, калі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей аддаюць перавагу мове, на якой больш магчымасцей атрымання адукацыі, кар’ернага росту і г.д. Знікненне мовы адбываецца ў тры этапы. Спачатку на роднай мове пачынаюць гаварыць толькі дома. Потым адбываецца забыванне адценняў значэння, мова спрашчаецца. Каб выказаць патрэбную думку, носьбіту даводзіцца звяртацца да другой мовы. Апошні этап – на роднай мове гавораць толькі старыя. Калі паміраюць апошнія носьбіты, знікае мова. Так, напрыклад, копцкая мова была выцеснена арабскай у Егіпце ў VII стагоддзі. Іспанская і партугальская мовы – мовы каланізатараў – цалкам выцеснілі многія мовы індзейцаў ў Паўднёвай Амерыцы.